жр 3256 07/222

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ! Бібліятэка АН БССР ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

# Сталінская праўда

Орган Петрыкаўскага РК КП(б)Б

№ 1 | Нядзеля, 20 чэрвеня | 1943 г.

**Адпомсцім нямецка-фашысцкім мярзотнікам за разграбленне і разбурэнне нашых гарадоў і вёсак, за гвалты над жанчынамі і дзецьмі, за забойства і вываз у нямецкае рабства савецкіх людзей!**

## З паведамленняў Совінфармбюро

(За дэкаду)

Нашай авіяцыяй у Чорным моры патоплена нямецкая падводная лодка. У Барэнцавым моры патоплены танкер і транспарт праціўніка.

На Заходнім фронце нашы часці знішчылі да 1000 нямецкіх салдат і афіцэраў, разбілі многа дзотаў праціўніка.

Паўночна-заходнее Мцэнска праціўнік не спыняе спроб вярнуць страчаныя нядаўна пазіцыі і ўводзіць у бой свежыя падраздзяленні. Некалькі разоў немцы пераходзілі ў атакі, але былі адкінуты і больш актыўнасці не праяўлялі. У рэзультаце баёў за апошнія дні на гэтым участку знішчана да 2.000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

У раёне Жыздры праціўнік сілай батальёна пяхоты імкнуўся весці разведку боем. Спачатку праціўніку ўдалося пацясніць наша баявое ахраненне і заняць часць нашых траншэй. Контрударам нашы байцы выбілі праціўніка і поўнасцю аднавілі становішча. Знішчана 150 гітлераўцаў.

У раёне Белгарада батальён нямецкай пяхоты імкнуўся захапіць вышыню і рошчу, якія абараняла наша падраздзяленне. Не гледзячы на колькасную перавагу праціўніка, нашы байцы адбілі атаку гітлераўцаў. У выніку боя знішчана да 120 нямецкіх салдат і афіцэраў. Захоплена 8 кулямётаў, 70 вінтовак і іншае ўзбраенне.

У раёне Лісічанска атрад аўтаматчыкаў праціўніка імкнуўся пераправіцца на левы бераг ракі Паўночны Данец. Агнём баявога ахранення знішчана некалькі дзесяткаў гітлераўцаў. Многа варожых салдат патанула ў рацэ.

## Налёты нашай авіяцыі на чыгуначныя вузлы, станцыі і аэрадромы праціўніка

У ночы на 13 чэрвеня наша авіяцыя дальняга дзеяння буйнымі сіламі зрабіла налёт на чыгуначныя вузлы Гомель, Бранск і станцыю Карачэў. Эфектыўнай бамбардыроўцы былі падвергнуты скапленні эшалонаў праціўніка і склады боепрыпасаў. Наглядaннем нашых лётчыкаў адзначана больш 100 пажараў, якія суправаджаліся моцнымі выбухамі. 2 нашых самалёты не звярнуліся на свае базы.

* * *

У ночы на 16 чэрвеня наша авіяцыя дальняга дзеяння зрабіла налёт на чыгуначныя вузлы Унеча, Рослаўль, Навазыбкаў. Разбіта і спалена многа эшалонаў. Усе нашы самалёты звярнуліся на свае базы.

* * *

У ночы на 18 чэрвеня і днём 18 чэрвеня наша авіяцыя зрабіла налёт на аэрадромы праціўніка.

Асабліва эфектыўнай бамбардыроўцы былі падвергнуты нямецкія самалёты, якія знаходзіліся на адным з аэрадромаў у Данбасе і на аэрадромах праціўніка пад Ленінградам. Узнікла многа пажараў.

У выніку бамбардыроўкі знішчана на зямлі вялікая колькасць нямецкіх самалётаў. Тры нашых самалёты не звярнуліся на свае базы.

## Вынікі налёта нашай авіяцыі на чыгуначны вузел Магілёў

Атрымана паведамленне аб тым, што ў выніку бамбардыроўкі нашай авіяцыяй чыгуначнага вузла Магілёў знішчан мост праз раку Днепр, разбіта многа чыгуначных саставаў і ўзарвана тры склады праціўніка з боепрыпасамі. Знішчана некалькі сот нямецкіх салдат і афіцэраў.

## Новыя поспехі саюзных войск

Пасля бесперапыннай 24-гадзіннай бамбардыроўкі з паветра і абстрэлу з мора 13 чэрвеня капітуліраваў італьянскі гарнізон острава Лампедуза. Остраў заняг саюзнікамі. 13 чэрвеня раніцай адзін з эсмінцаў саюзнікаў наблізіўся да другога італьянскага острава Ліноса. Гарнізон праціўніка поўнасцю здаўся.

14 чэрвеня саюзнікі занялі італьянскі остраў Лампіёне, які знаходзіцца ў Сіцылійскай пратоцы, на паўночны захад ад острава Лампедуза. (ТАСС)

## Япона-кітайская вайна

Па даным кітайскага камандавання, кітайскія войскі занялі горад Сунцзы, які расположан паміж Ічанам і Шашы, на паўднёвым беразе ракі Янцзы (правінцыя Хубэй). Апрача гэтага кітайскія войскі зноў занялі некалькі стратэгічных пунктаў у гэтым раёне.

У камюніке паведамляецца аб адступленні японскіх войск у паўднёвай частцы правінцыі Хубэй. Ва ўсходняй частцы правінцыі Хубэй кітайскія войскі занялі 2 населеных пункты.

(ТАСС).

# Помста і смерць нямецка-фашысцкім нягоднікам!

## Мы адпомсцім за цябе, родны горад

Жыхары Петрыкава добра памятаюць, якім быў іх родны горад да прыхода нямецкіх захопнікаў. Петрыкаў вабіў да сябе сваімі прыгожымі вуліцамі, светлымі і ўтульнымі дамамі, мноствам грамадскіх і культурных устаноў, якія здавальнялі рознастайныя патрэбы жыхараў горада.

Прышлі немцы і апаганілі гэты горад, апаганілі серабрыстую Прыпяць, разносячую ў даль свае воды, апаганілі вуліцы і дамы. Петрыкаў ператварыўся ў месца турмаў і шыбеніц. Толькі папялішчы і руіны сведчаць аб месцы знаходжання грамадскіх і культурных устаноў.

Больш 60 працэнтаў насельніцтва знішчана альбо вывезена ў Германію. За горадам ужо створаны курганы ад трупаў нашых братоў і сясцёр, замучаных крывавымі бандытамі.

Парк, які радаваў вока кожнага петрыкаўчаніна, немцы зрабілі стойлам для сваіх коней. Памяшканні прамысловых арцелей служаць месцам турэмнага зняволення.

Цяжка нам зараз пазіраць на свой родны горад, але мы за яго адпомсцім. Недалёк той час, калі ён ачысціцца ад гітлераўскай чумы. Тады мы залечым яго рачы, узнімем яго з руін.

**Васіль П** — партызан энскага атрада.

## У германскай няволі

3-га сакавіка 1943 г. нас немцы схапілі і, як жывёлу, прымусам загналі ў вагон і павезлі ў германскую няволю. У вагонах мы змяшчаліся па 50-60 чалавек. Ніякай ежы нам не давалі, адзін раз у тры дні давалі нам вады.

20 дзён мы былі ў дарозе. Толькі 23 сакавіка прывезлі нас у горад Тройбург (Усходняя Прусія). Пасля таго, як нас выгрузілі з вагонаў, мы папалі на нявольніччы рынак.

Купіў нас кулак Бруж за 20 марак. Купіў як рэч, танную рэч. І пачалася катаржная праца на кулацкім полі. Ніякай літасці не меў немец-кулак да нас, рускіх людзей. Варта было толькі прысесці на хвіліну ад знямогі, як ён з'яўляўся з палкай і біў да беспрытомнасці. Працаваць прыходзілася ад цямна да цямна, а есці нам давалі баланду і па 100 грам хлеба на снеданне і абед.

Не маглі мы, свабодалюбівыя рускія людзі, гнуць сваю спіну перад нямецкімі нягоднікамі, і рашылі ўцячы.

Зараз мы ў партызанскім атрадзе. Доўга мы будзем помніць крывавыя злачынствы нямчуры. За ўсё мы ім адпомсцім.

**Іван Ц., Мікалай К.**

## Маё слова да паліцэйскіх

Я быў начальнікам паліцыі на станцыі Капцэвічы. На маіх вачах немцы рабілі ўсе свае брудныя, бандыцкія справы — палілі вёскі, кідалі жывымі ў агонь нявінных людзей — старыкоў, жанчын і дзяцей. Я быў саўдзельнікам гэтых злачынстваў, але не мог я далей так жыць. Сумленне мучыла мяне, і я ўцёк у лес.

6 дзён я разам з жонкай бадзяўся па лесе, не адважваўся ісці да партызан. Думаў я, што партызаны заб'юць мяне, як начальніка паліцыі. Нарэшце, я з'явіўся ў адзін з партызанскіх атрадаў. Там мяне сустрэлі родныя савецкія людзі, якія далі мне магчымасць згладзіць сваю віну перад Радзімай і беларускім народам.

Сваёй службай у паліцыі я саваршыў найвялікшае злачынства, але я прыкладу ўсе сілы і намаганні, каб апраўдаць сябе бязлітаснай барацьбой з нямецкімі фашыстамі.

Зараз я звяртаюся да ўсіх паліцэйскіх Петрыкава, Капцэвіч і іншых гарнізонаў. Следуйце майму прыкладу, пераходзьце са зброяй ў руках да партызан. Толькі гэта вам дасць магчымасць апраўдаць сябе перад народам.

**Цеслік Ігар Данілавіч** — былы нач. паліцыі ст. Капцэвічы.

## Яны мне выкалалі вочы

Я хачу расказаць аб нечуваным злачынстве, якое немцы ўчынілі нада мной, як над многімі іншымі савецкімі людзьмі.

Нядаўна немцы ўварваліся ў нашу вёску Б. Як лютыя звяры, яны ў маёй хаце ўсё разварушылі, перабілі, а потым схапілі мяне і бандыцкім нажом выкалалі мне вочы.

Зараз я нічога не бачу. З маіх сляпых вачэй льюцца гарачыя слёзы нянавісці і крыўды — нянавісці да людаедаў-немцаў, крыўды за маіх братоў Уладзіміра і Эдуарда, якія здрадзілі Радзіме і служаць у нямецкай паліцыі. Я іх ненавіджу, сваіх братоў-здраднікаў.

Нічога я не бачу, але мае позіркі звернуты на ўсход. Я ведаю, што адтуль прыдзе вызваленне. Чырвоная Армія і героі-партызаны адпомсцяць фашысцкаму звяр'ю і іх пасобнікам за ўсе іх крывавыя злачынствы.

З слоў Маланні Х. запісаў **Алесь К.**

## Перахітрылі фрыцаў

Чатыры баявых таварышы падпаўзалі да чыгункі. Адна хвіліна, і міна падкладзена, замаскіравана. Таварышы адпаўзаюць. Старшы групы Павел размяркоўвае абавязкі.

Чакаць доўга не прышлося. Хутка хлопцы прыкмецілі — чатыры фрыцы, сагнуўшыся і аглядаючыся ва ўсе бакі, ідуць па палатну. Вось яны ўжо заўважылі міну і адправілі двух паведаміць астатнім. Праз некалькі хвілін з двух будак ужо сюды накіроўвалася да 40 гітлераўцаў.

Падпусціўшы фрыцаў на блізкую адлегласць, партызаны пацягнулі за шнур. Міна ўзарвалася. Адразу-ж народныя мсціўцы адкрылі агонь з поўаўтаматаў. 6 фрыцаў было забіта. Астатнія ў беспарадку паўцякалі.

**Міхась М.** Энскі партызанскі атрад.

Рэдакцыйная калегія.

Выданне Петрыкаўскага РК КП(б)Б